*Аляксей Рагуля*

# КАНЦЭПТ САМ-СІТУАЦЫЯ<br>Ў БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ І АВАНГАРДНАЙ КУЛЬТУРЫ

***(да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа)***

Роля крытычнай сітуацыі ў тэорыі пазнання стала прадметам павышанай увагі ў другой палове XX ст. Афіцыйная ідэалогія намагалася перапыніць аналітычную дынаміку на шляху да комплексу праблем, звязаных з даследаваннем сітуацыі маральнага выбару. Менавіта на гэтай праблематыцы была сканцэнтравана ў свой час увага заходнееўрапейскага экзістэнцыялізму – індывідуалістычнай філасофіі існавання. Экзістэнцыяльная арыентацыя стала мужным прарывам еўрапейскай думкі ў блакадзе таталітарысцкай ідэалогіі.

Асэнсаванне крытычнай сітуацыі ў бесчалавечнай рэчаіснасці XX-га стагоддзя лагічна выводзіла антрапалагічны пошук да спасціжэння *знакаў бяды* на дарозе жыцця, якое ў эпоху татальнага крызісу бюракратычна-гандлёвага соцыуму стала існаваннем у *пустотным часе*, пазбаўленым чалавечага сэнсу і чалавечых інтарэсаў. Таталітарысцкая індустрыя дэтэрытарызацыі, рассяляньвання, разбацькаўлення і рассынаўлення асобы пакідае ёй адзіную магчымасць быць чалавекам – па-людску памерці. У сітуацыі татальнага крызісу сучаснага бюракратычна-гандлёвага соцыуму зварот да народнай філасофіі існавання стаў актуальнай праблемай не толькі ў тэорыі пазнання, але і ў тэорыі жыцця.

Фальклорны экзістэнцыялізм валодае вялікім арсеналам канцэптуальнага ведання і разумення чалавечага свету, чаго нельга сказаць пра фрагментарнае навуковае веданне, адпрэчанае ад чалавечай душы. У беларускай народнай культуры каштоўнасны патэнцыял чалавечай душы ўвасоблены пераважна ў музычнай сімволіцы. У творчасці Паўлюка Багрыма, К.Каліноўскага, Ф.Багушэвіча, Старога дзеда Савіцкага, Рэдкага вешчая душа чалавека жыве ў скрыпцы, цымбалах, дудцы і вешчым слове. Без акумуляванага ў беларускім фальклоры вопыту душы еўрапейская філасофія існавання застаецца фатальна аднабокай, індывідуалістычна арыентаванай на «жыццё ў смерць». Думка Ф.Шылера пра тое, што краса ўратуе свет, у казках палешукоў мае вельмі істотнае завяршэнне: пры ўмове, што людства спачатку ўратуе гэтую красу, ці больш дакладна, – хараство. У беларускай народнай культуры яго сутнасць увасоблена ў вобразе дзяўчынкі-падлетка. Гэты матыў стаў вытокам і пачаткам беларускага ліраэпасу XX ст. Сацыяльная эстэтыка і канцэптуалізм фальклору набылі сілу жывой вады, што вярнула да жыцця магутныя рэсурсы духоўнага імунітэту нацыі ў яе супрацьстаянні некрафільству і найноўшым мадыфікацыям квазіканцэптуалізму.

Сумарны сэнс беларускага канцэптуалізму навейшага часу быў дакладна азначаны Ф.Багушэвічам у канцы XIX ст. у вербальнай форме выніковага выказвання, сціслага і сэнсаёмкага: «Кепска будзе». Такі загаловак мае адна з яго паэмаў народнага лёсу. Творчасць Ф.Багушэвіча – гэта эстафета праўды, выказанай у «Лісце з-пад шыбеніцы» Кастуся Каліноўскага: кепска будзе, калі Бацькаўшчына па-ранейшаму застанецца напаўжывой у цесных абдымках суседняй імперыі. Плач у паэзіі Ф.Багушэвіча над «народу сконам» нагадвае галашэнне з пахавальнага абраду. Разам з тым яго паэзія прасякнута, як і абрадавыя дзействы і рэпертуар, духам пераадолення ўлады смерці, пафасам выйсця з-пад улады замагільнага Наўя. У фальклорнай філасофіі існавання трагедыйны пафас спалучаецца з *крытычным аптымізмам*, сутнасць якога ўпершыню азначыў Уладзімір Самойла ў філасофскім эсэ «Гэтым пераможаш!..» (1924).

Экзістэнцыяльная канцэпцыя ў яе індывідуалістычнай мадыфікацыі абудзіла да дзеяння еўрапейскі дух у XX ст., але вытокі філасофіі існавання пачынаюцца ў глыбокай старажытнасці. Арыэль Голан адкрыў яе сутнасны змест у бел-чырвона-чорнай каляровай гаме эпохі верхняга палеаліту [1, 36 – 47]. У этыцы мацярынскага роду пераважае гарызантальная дынаміка. Пра гэта сведчыць паэтыка старажытных абрадаў, заснаваных на топіцы абходаў, г.зн. кругоў ці авалаў, якія адлюстроўваюць аб'ёмную, галаграфічную ці сферычную карціну жыццядзеяння і пазнання. Абрад трымаецца на магіі фізічных кантактаў, якія ўтвараюць семіёзіс *повязі вузла*, культ *гуртавога* сродкамі гарызантальнай эманацыі праз абмен сустрэчнымі энергетычнымі струменямі. Стымулююць да ўмацавання агулу і вербальныя формы імператыву: «Ліга!» («Разам!»). Гуртавое адзінства прынцыпова адрозніваецца ад монатэістычнага адзінага, якое ў філасофіі Плаціна было дарункам неба. У традыцыйнай культуры абшчыны сэнсы *ліга, разам, повязь* з'яўляюцца прадуктам супольнай творчасці чалавечага розуму і Маці-прыроды. Насычаныя энергетыкай канцы вясельнага ручніка завязваюцца ўнізе вузлом, які таксама ёсць магія, што мае на мэце працяг жыцця.

Гарызантальная дынаміка ў этыцы родавай і тэрытарыяльнай грамады пазней стала асновай этнічных саюзаў крывічоў, дрыгвічоў, радзімічаў. Крывічы стварылі канфедэрацыю, якая раскінулася на абсягу Усходняй Еўропы ад вярхоўяў Дняпра і Волгі да Панямоння. Вопыт непрымусовай кансалідацыі і этнічнага самаканстытуявання без апекі сваіх ці чужых тыранаў у XIII ст. будзе выкарыстаны паўторна, пад час утварэння магутнай канфедэратыўнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Прынцып *старыны не рухаці, навіны не ўвадзіці* на справе дэманструе ролю духоўнага пачатку і самастойнасці ў дзяржаўным будаўніцтве.

Для беларускага этнасу сёння важнае значэнне мае вопыт этнічнага самазахавання і развіцця ў XIX ст. Контррэфармацыя ў XVII ст. перайшла да палявання на ведзьмаў. Спаленне філосафа Казіміра Лышчынскага ў 1689 г., як і спаленне Джардана Бруна ў 1600 г., спапяліла гераічны энтузіязм еўрапейцаў. Брытанскі эмпірызм скіраваў навуку на шлях пазітывізму, вузкага прагматызму і паліткарэктнасці. Першапачатковыя сэнсы чалавечага існавання навука пакінула па-за сферай увагі, якраз тады, калі ўзнікла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пільная патрэба ў спасціжэнні антрапалагічнага вопыту абшчыны. Дзевятнаццатае стагоддзе ўзаконіла разрыў паміж душой і розумам у кагнітыўным дзеянні. У Беларусі кіраўнічая вяльможная чэрнь ужо ў канцы XVII ст. была добраахвотна дэнацыялізавана і дэмаралізавана. У выніку этнас страціў сваю саслоўна-дэмакратычную рэспубліку. Імперская ідэалогія Расіі ставіла сваёй мэтай дэфармацыю беларускага этнасу да поўнай страты ім уласнага аблічча і здольнасці культуратворчага дзеяння. Любыя сродкі лічыліся прыдатнымі, а самым надзейным – дэнацыяналізаваная школа і выхаваныя ў духу янычарскай нянавісці да ўсяго роднага настаўніцтва і нізавая бюракратыя з тутэйшых.

Рэпрэсіі, рэкрутчына, адмена Статута, закрыццё Віленскага ўніверсітэта (1832) – усё гэта магло паказацца нібыта і сапраўды перавярнула ВКЛ у Паўночна-Заходнюю ўскраіну імперыі.

Заставалася, аднак, жывой *мужыцкая праўда*. Афіцыёзу не ўдалося зламаць сілу духоўнага супраціўлення ў фальклоры, не ўдалося стварыць мутанта – афіцыйную народную культуру.

Беларускія асветнікі ў XIX ст. па-ранейшаму кіраваліся ў сваёй дзейнасці планам унутранай імманенцыі – энергіяй архетыпнага імпульса, які скіроўвае асобу на пошук і ўсталяванне адносін блізкасці і роднасці. На паверхні беларускай культурнай прасторы ў XIX ст. узнікае даволі шырокая сетка лакальных утопіяў. Ва ўладаннях Радзівілаў, Храптовічаў, Завішшаў, Тышкевічаў, Агінскіх, Манюшкаў ствараюцца школы для сялянскіх дзяцей і тэатры. Абуховічы і Манюшкі раздалі сялянам зямлю. Завішшы скасавалі прыгоннае права. Магдалена Радзівіл у пачатку XX ст. фінансавала беларускі адраджэнскі рух і загадала ўсім сваім службам весці справаводства на беларускай мове. У «рэспубліцы» Паўтава на Віленшчыне былі свае грошы і парламент.

Нашаніўскі перыяд (1906 – 1915) быў падрыхтаваны папярэдняй этнакансалідацыйнай дынамікай. Якраз у гэты час у беларускім грамадстве выспявае патрэба ў пашырэнні семантычнага поля народнай культуры. На фальклорнай аснове фарміруецца гратэскны рэалізм, які семантыку народнай культуры выводзіць за межы вяночнага ці пагоннага двара. Якуб Колас у прадмове да паэмы «Сымон-музыка» ўпершыню актуалізаваў сістэму фальклорнага кагнітыўнага дзеяння цалкам, у закончаным яе выглядзе: *з'яўленне – пераадоленне – выйсце*. У філасофіі XX ст. пераадоленне трактуецца як крытычная сітуацыя. У сучасным абрадазнаўстве гэты момант азначаны лексемамі *лімінальны стан* – паласа вышэйшага напружання ў змаганні *явы* і *наўя* ў час зімовага і летняга сонцаваротаў. Культура земляробчага каляндара арыентуе на ўстойлівы канон – змаганне і абавязковую перамогу, працяг жыцця.

Праграмны паэтычны трактат Я.Коласа ў цэнтр увагі ставіць пытанне пра адказнасць за спадчынны скарб, які з'явіўся як вынік напластавання культурных сэнсаў, здабытых працай пакаленняў. Сэнс творчага жыцця заключаецца ў тым, каб атрыманы ў спадчыну духоўны скарб узбагаціць новымі здабыткамі і перадаць яго ў абноўленым выглядзе новым пакаленням: І гэты скарб, пазычаны, адбіты / У сэрцы пяражыты / І росамі абмыты / Дзянніц маіх, дзянніц маіх мінулых, / Для вас душою чулых. / Як доўг, як дар, / Дае пясняр [2, 283].

Дар, падрыхтаваны паэтам для «душою чулых» нашчадкаў – гэта яго народны ліраэпас – унікальная духоўная каштоўнасць у акіяне празаічнай свядомасці, роўных якой да гэтага часу няма ў еўрапейскіх літаратурах. У творчасці Я.Коласа адлюстравана новае бачанне і разуменне магчымасцяў беларускага народа ў справе абнаўлення жыцця на зямлі. І разам з тым паэт перасцерагае аб тым, што безадказнасць у крытычнай (лімінальнай) сітуацыі можа прывесці нас не ў «казку жыцця», а да правалу ў халодны вір ці, удакладнее В.Быкаў, у радыёактыўную ваўчыную яму ў геаграфічным цэнтры Еўропы.

Янка Купала, глыбока ўсведамляючы гісторыятворчы патэнцыял уласцівай беларускаму менталітэту самасці, звяртаецца да традыцыі фальклорнай містэрыі. Свайго героя – а гэта можа быць Светавід, Прарок, Дух непрыгонны – разнавіднасць гегелеўскага абсалютнага духу ці, нарэшце, звычайны чалавек, часцей за ўсё мужык, – Сам-чалавек, якога Я.Купала ставіць сам-насам перад сусветным злом. Яно паўстае ў міфалагізаваным выглядзе, але пад покрывам міфалагічнага вэлюму выразна праглядаюцца персаніфікаваныя абліччы інстытуцый з напаўразваленай імперыі. Відмы, іх «таварышы» з вяроўкамі на шыі, русалкі – ахвяры, а цяпер памочнікі ў сваіх катаў, – усе яны ва ўладзе Чорнага, уладара ў Замчышчы, у якім, ведае Сам, знаходзіцца ўкрадзены скарб народа. Уся гэтая сіла выконвае рытуал закляцця вакол Сама, каб зламаць яго волю і ўсіх супакоіць і пасадзіць – «Для навукі, для прымеру, / Як паступкам знаці меру»: Як фігуркі выразаны, / Як бібулы маляваны, / Як грыбы ў спляснелай глебе: / Вочы к небу, губы к небу! / Усе жыцця здушыце з'явы, / Цемра тут закон і права! [3, 66]

Змаганне ў містэрыі «Сон на кургане» працягваецца. Да перамогі далёка, таму што супольны герой, беларускі этнас, застаецца раз'ядналым, а нацыянальная думка не ўзнялася да разумення той ісціны, што чалавечую сітуацыю народ стварае сабе сам.

Створаная Я.Купалам Сам-сітуацыя на фоне Праметэй-сітуацыі, Іоў-сітуацыі і Фаўст-сітуацыі ўспрымаецца як новае слова пра патэнцыял, магчымасці чалавека ў тварэнні і дасканаленні свайго жыцця.

**Спіс літаратуры:**


1. Голан, А. Миф и символ / А. Голан. – М.: РУССЛИТ, 1994. – 375 с.
2. Колас, Я. Збор твораў у 14 т. / Я. Колас. –Т.6. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – 614 с.
3. Купала, Я. Поўны збор твораў / Я. Купала. – Том 7. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2001. – 398 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ